УДК 1.631.527 : 633.11

Д. І. ДАДЗЕРКІНА

СЕЛЕКЦЫЙНАЯ АЦЭНКА ЗЫХОДНАГА МАТЭРЫЯЛУ ВУЗКАЛІСТАГА ЛУБІНУ ВА ЎМОВАХ ПАЎДНЁВАГА ЎСХОДУ БЕЛАРУСІ

Пашырэнне пасяўных плошчаў зернебабовых культур стрымліваецца адсутнасцю высокапрадукцыйных сартоў са стабільнай па гадах насеннай прадукцыйнасцю. У апошнія гады ўзрасла цікавасць да вузкалістага лубіну, аднак гэты від мае слабую селекцыйную прапрацоўку і для стварэння сартоў, якія б адпавядалі патрабаванням вытворчасці, неабходна мець зыходны матэрыял з такімі гаспадарча-каштоўнымі прыкметамі, як скараспеласць, высокая прадукцыйнасць, абмежаванасць роставых працэсаў, устойлівасць да асыпання і каранёвых гніляў.

Калекцыя вузкалістага лубіну нешматлікая, і вывучэнне яе з мэтай выяўлення формаў з гаспадарча-каштоўнымі прыкметамі і біялагічнымі ўласцівасцямі, высокім адаптыўным патэнцыялам да глебава-кліматычных умоў поўдня Беларускай ССР уяўляе цікавасць для селекцыйнай работы. У гэтай зоне пераважаюць дзярнова-падзолістыя супясчаныя і пясчаныя глебы, на якіх часта адчуваецца дэфіцыт вільгаці.

Даследаванні праводзіліся на Рагачоўскім дзяржаўным сортавыпрабавальным участку Гомельскай вобласці ў 1985, 1987, 1988 гг. на дзярнова-падзолістых супясчаных глебах з сярэднім узроўнем урадлівасці. Для вывучэння былі ўзяты 64 узоры калекцыі ВІР і БелНДІЗ. Вывучэнне зыходнага матэрыялу праводзілі па методыцы ВІР.

У задачу нашых даследаванняў уваходзіла вывучыць калекцыю ўзораў вузкалістага лубіну па насеннай прадукцыйнасці, працягласці міжфазных і поўнага вегетацыйнага перыядаў, тыпах галінавання, элементах прадукцыйнасці, семяўтваральнай здольнасці, вышыні. Акрамя таго,

патрэбна было ацаніць узоры на ўстойлівасць да асыпання, палягання, вегетатыўнага буяння ў палявых умовах і вылучыць крыніцы пэўных прыкмет, уключыць іх у селекцыйны працэс і атрымаць новы зыходны матэрыял з комплексам гаспадарча-каштоўных адзнак і ўласцівасцей.

Узоры, якія вывучаліся, моцна адрозніваліся па марфатыпу і на аснове гэтай розніцы былі аднесены да трох груп.

1. Узоры са звычайным (дзікім) тыпам галінавання. Гэта самая шматлікая група (49 узораў), для якой характэрны неабмежаваныя роставыя працэсы, што прыводзяць у вільготныя гады да моцнага вегетатыўнага буяння.

2. Узоры з блакіраваным галінаваннем другога парадку, у якіх бакавыя суквецці фарміруюцца на ўкарочаных парастках у верхняй частцы сцябліны. У раслін гэтага тыпу на галінках першага парадку добра завязваюцца струкі і выспяваюць адначасова з галоўнай гронкай. Вывучана 13 узораў гэтага тыпу (12 узораў серыі Taic і Mut-1).

3. Узоры з коласападобным тыпам галінавання, у якіх усе струкі фарміруюцца на галоўнай гронцы, таму што галінаванне ў верхняй частцы блакіравана струкамі. Вывучаны два ўзоры такога тыпу (Ланедэкс-1 і Аліна).

Феналагічныя назіранні паказалі, што ўзоры вузкалістага лубіну, якія вывучаліся, па працягласці вегетацыйнага перыяду былі генетычна рознымі і на аснове гэтых адрозненняў былі аднесены да чатырох груп па тэрмінах выспявання. Працягласць вегетацыйнага перыяду з'яўляецца важнейшай сартавой і экалагічнай уласцівасцю раслін.

Праблема стварэння скараспелых сартоў вузкалістага лубіну стаіць вельмі востра, паколькі сарты, якія ў нас ёсць, у вільготныя гады моцна буяюць і выспяваюць позна. Таму для вывядзення новых сартоў неабходна знайсці крыніцу ранняспеласці з задавальняючай прадукцыйнасцю і вызначыць фазы развіцця, якія ў найбольшай ступені ўплываюць на працягласць вегетацыйнага перыяду. Працягласць вегетацыйнага перыяду ў гады вывучэння значна змянялася пад уплывам умоў надвор'я. Так, у 1988 г. працягласць вегетацыйнага перыяду вагалася ад 72 да 126 сут (г. зн. самыя познія выспявалі як напаўраннія), у 1985 г.— ад 97 да 134, у 1987 г.— ад 101 да 159 сут.

З 64 узораў толькі два былі аднесены да вельмі ранняй групы, адзін— да ранняй, 45 — да сярэдняспелай, 15 — да позняй. Розніца па часе выспявання вельмі ранніх і познаспелых узораў у сярэднім за тры гады склала 47,8 сут. У сярэднім за 1985—1988 гг. працягласць вегетацыйнага перыяду ў вельмі ранніх узораў склала 90,8 сут, у сярэдняспелых — 121,8, у познаспелых — 138,7 сут (табл. 1).

Акрамя агульнай працягласці вегетацыйнага перыяду ўлічвалі працягласць міжфазных перыядаў: поўныя ўсходы — поўнае цвіценне, поўнае цвіценне — поўнае выспяванне. Працягласць міжфазных перыядаў вызначалася ўзаемадзеяннем генатыпу з комплексам фактараў знешняга асяроддзя: святлом, вільгаццю, цяплом. У нашых доследах працягласць перыяду ўсходы — поўнае цвіценне ў залежнасці ад года і ўзору

Табліца 1. **Працягласць вегетацыйнага перыяду ў розных груп скараспеласці вузкалістага лубіну, сут**

Група скараспеласці	Колькасць узораў	1985 г.	1987 г.	1988 г.	Сярэдняе
Вельмі ранняя (71—101 дзень)	2	98,5	101,0	73,0	90,8
Ранняя (102—115)	1	114,0	113,0	87,0	113,3
Сярэдняспелая (116—145)	46	127,8	129,6	108,1	121,8
Познаспелая (146—180)	15	128,7	153,1	134,1	138,7